УДК 32.001

# АМБІВАЛЕНТНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ У КАНЦЫ XX СТАГОДДЗЯ

У.П. Рубінчык,
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ, г. Мінск

У жніўні 2001 г. спаўняецца 10 год з моманту фармальнага атрымання Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці. Напярэдадні гэтага юбілею ёсць падставы паразважаць аб пройдзеным шляху з пункту гледжання станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Задача гэтая няпростая: кожны з назіральнікаў тлумачыць нядаўнія падзеі на свой капыл. Сапраўды, розныя ўдзельнікі палітычнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь ішлі рознымі шляхамі, і нават не заўжды да адной мэты. Супярэчлівасць вынікаў і з'яўляецца прадметам разгляду ў дадзеным артыкуле.

Пачнем з вызначэння тэрмінаў, таму што без моўнай дакладнасці проста ня можа быць ані "самавызначэння" асобы ці калектыўнага носьбіта мовы, ані нават паспяховай рэфлексіі на тэму самавызначэння.

"Нацыю" мы разумеем як палітычную супольнасць грамадзянаў, рухомую і дзеяздольную. Наша інтэрпрэтацыя знаходзіцца ў рэчышчы французскай традыцыі, дзе нацыя – аб'яднанне ўсіх грамадзянаў краіны, што ня толькі падпарадкоўваюцца адзінаму заканадаўству, але жадаюць і могуць браць удзел у грамадскім жыцці праз "штодзённы рэферэндум" (Э. Рэнан). Лічым, што беларускую нацыю і "нацыянальнасць" ня варта, як тое часта робіцца, атаесамляць з беларускім этнасам. Эліты Рэспублікі Беларусь у асноўным пагаджаюцца на інтэграцыю грамадзянаў розных субэтнасаў у межах унітарнай "дзяржавы-нацыі", дзе беларускі этнас з'яўляецца мажарытарным і тытульным. Ніводны сур'ёзны палітык у 1990-я гады не клапаціўся пра "этнічную чысціню" беларускай нацыі, што знаходзіцца ў працэсе адбудовы.

Мы пэўныя ў тым, што атрыманне незалежнасці de jure спрыяе набыццю незалежнасці de facto. Прасцей кажучы, "Хочаш быць незалежным – будзь ім. Мы абвесцілі незалежнасць – значыць, мы незалежныя..." (У. Мацкевіч, беларускі філосаф і палітолаг). Відавочна, аднак, што палітычнае самавызначэнне Беларусі не скончана і само мусіць разглядацца як нацыятворчы працэс. З'ява гэтая ў гісторыі ня новая: праблема ж у тым, што кожная нацыя, верагодна, вымушаная вучыцца на ўласных, а не чужых памылках. У ліку такіх "вучняў" апынулася (у вялікай ступені – міжволі) і беларуская нацыя, развіццё якой бачыцца вельмі парадаксальным, супярэчлівым – амбівалентным.

Тэрмін "амбівалентнасць" першапачаткова ўжываўся ў псіхалогіі і азначаў "суіснаванне ў глыбіннай структуры асобы ўзаемавыключных эмацыйных установак (напрыклад, любові і нянавісці)" [1]. Пазней Р. Мертан выпрацаваў канцэпцыю амбівалентнасці што да сацыяльных працэсаў. Мы лічым, што гэты тэрмін як нельга лепей падыходзіць для аналізу беларускай рэчаіснасці 1990-х гг. Э. Блейлер вылучаў тры тыпы амбівалентнасці: 1) эмацыйную – пазітыўнае і адначасова негатыўнае стаўленне да некай асобы; 2) валявую – што выяўляецца ў бясконцых ваганнях паміж супрацьлеглымі рашэннямі і часам – у адмаўленні ад будзь-якога дзеяння; 3) інтэлектуальную, якая ёсць спалучэнне антаганістычных ідэй у розуме. Эмацыйная амбівалентасць характэрная ў Беларусі перадусім для "простых грамадзянаў" (але ж ці не з'яўляецца апошняе словазлучэнне саступкай інтэлектуальнай амбівалентнасці, бо ва ўмовах

пабудовы дэмакратычнай дзяржавы ня можа быць "простых"?), інтэлектуальная – для навукоўцаў, валявая – для палітыкаў. Імі могуць быць і "простыя людзі", і навукоўцы, аднак на ўвазе найперш маюцца "полісімэйкеры" – тыя, хто прымае рашэнні, палітыкі паводле прызначэння" (М. Вебер).

Амбівалентнасць сінанімічна дваістасці, двухсэнсоўнасці. Магчыма, сумяшчэнне несумяшчальнага ўвогуле закладзена ў чалавечую прыроду (прынамсі, гэтак лічыў З. Фройд, паводле якога структура асобы спалучае актыўныя і пасіўныя вітальныя імпульсы). Усё ж "амбівалентнасць" – сітуацыя з намяркоўным напружаннем сіл, у адрозненне ад "антаганізму". Яна прадугледжвае наяўнасць абмежаванай прасторы, дзе супярэчнасці могуць суіснаваць і, у рэшце рэшт, "здымацца", адпаведна з гегелеўскай трыядай "тэзіс-антытэзіс-сінтэз". Адмаўляць жа існавання такой прасторы – беларускай нацыі – ня можа ніхто, хоць у публіцыстыцы беларусы раз-пораз і называюцца "недаспелай нацыяй" ці "кланам кланаў".

10-гадовая гісторыя Рэспублікі Беларусь досыць багатая на падзеі, што аказалі рашучы ўплыў на сучаснасць і будучыню палітычнага самавызначэння. Шмат якія акцыі будуць ацэнены як вызначальныя ўжо таму, што былі першымі, а значыць, сімвалічнымі: стварэнне ўласных узброеных сіл, выбары прэзідэнта, прыняцце аднаўленай канстытуцыі. Аднак парадаксальнасць менавіта ў тым, што першы этап самавызначэння – да сярэдзіны 1995 г. – рабіўся старымі элітамі, стаўленне якіх да "незалежнасці" было амбівалентным.

На нашу думку, памылкова лічыць, што самавызначэнне беларускай нацыі як суцэльнасці адбывалася толькі да 1994 г. – потым, маўляў, палітычны працэс быў навязаны народу "звонку". Да першых прэзідэнцкіх выбараў беларуская нацыя спакваля разгортвала свае інстытуцыі, але пасля 1994 г. гэты працэс не перапыніўся, хоць і прымаў часам іншыя формы (напрыклад, рэферэндумы, Усебеларускі сход). А. Лукашэнка быў абраны дэмакратычным шляхам і яго крокі павінны разглядацца як рэалізацыя некаторых глыбінных памкненняў і спадзяванняў вельмі значнай часткі беларускага грамадства. Іначай кажучы, ён карыстаецца падтрымкай з боку людзей, чыя палітычная культура амбівалентна і хаатычна par excellence – а такіх у Беларусі большасць. Паводле Канстытуцыі, прынятай у 1994 г., Вярхоўны савет стаў вышэйшым органам заканадаўчай улады, аднак большасць грамадзянаў, нават прыхільнікаў парламентарызму, не давала яму веры (нагадаем, што апазіцыя БНФ упарта дамагалася яго роспуску ў 1992-1994 гг.). Прыхільнікамі ж старой мадэлі кіравання Вярхоўны Савет успрымаўся як орган, дзе рэй вялі менавіта "дэмакраты" (што часткова было праўдай, калі ўзгадаць, што "радыкальныя" законы ў жніўні-верасні 1991 г. былі прынятыя пад ціскам БНФ). На працягу першай паловы 1990-х гг. ён катастрафічна губляў аўтарытэт, стаўшыся ледзь не сімвалам безладдзя. Адпаведна, амбівалентнасць калектыўнай палітычнай свядомасці мусіла захоўвацца і ў дачыненні да "першага дэмакратычнага" ўраду Кебіча, заглыбленага сваімі каранямі ў савецкі час. Неэфектыўнасць яго крокаў, што былі адзначаны валявой амбівалентнасцю (напрыклад, увядзенне нацыянальнай квазівалюты і імкненне да аб'яднання грашовых адзінак РБ і РФ) былі прычынай паразы Кебіча на прэзідэнцкіх выбарах 1994 г. Пасля свайго абрання А. Лукашэнка прыпыніў размыванне вобраза выканаўчай улады, выглядаючы, прынамсі, актыўнай фігурай – "барацьбітом з карупцыяй". У 1995 г. ён распачаў, а ў 1996 г. здолеў ліквідаваць вобраз двухсэнсоўнасці і амбівалентнасці ўладнай волі, сканцэнтраваўшы на сябе большую частку ўладных паўнамоцтваў як "усенародна абраны". Ён выявіў сябе як паслядоўны палітык, у адрозненне ад значнай часткі дэпутатаў Вярхоўнага Савета (доказам чаго служаць іх паводзіны пад час узбуджэння працэдуры імпічменту ў 1996 г.). Аўтарытэт Вярхоўнага Савета быў свядома прыніжаны А. Лукашэнкам яшчэ ў 1995 г. шляхам першага

рэферэндуму і заяў кшталту "Галасаваць ня буду, усё роўна падмануць". Недасфармаваны парламент ня мог стаць інстытуцыяй стрымлівання выканаўчай улады. Паводле прафесара В. Бажанава, "адсутнасць заканадаўчага органа пры рэспубліканскай форме кіравання з'яўляецца...становішчам дзяржаўнага перавароту. Двойчы на працягу 1995-1996 гг. такія сітуацыі ўзнікалі, але заставаліся незаўважанымі насельніцтвам" [2]. Спробы абаперціся на рашэнні і аўтарытэт Канстытуцыйнага суда былі ва ўмовах нізкай прававой свядомасці загадзя асуджаны на паразу. Такім чынам, з сярэдзіны 1990-х гг. пачынаецца новы этап палітычнага самавызначэння нацыі, дзе рэй вядзе выканаўчая ўлада, кантралюемая прэзідэнтам. Праўда, і яна ўспрымаецца насельніцтвам (пра што сведчаць сацыялагічныя апытанні) амбівалентна. У калектыўнай свядомасці часцяком рэпрадукуецца формула "добры цар, дрэнныя чыноўнікі", што падштурхоўвае А. Лукашэнку то заклікаць сваіх падначаленых да большай адказнасці "перад народам", то хваліць, то жорстка крытыкаваць, то валюнтарысцкім чынам звальняць. Вядома, што эліты, якія падтрымліваюць цяперашні рэжым, не з'яўляюцца гамагеннымі. Ім дазваляецца эмацыйная амбівалентнасць, аднак на справе яны мусяць так ці інакш умацоўваць уладу прэзідэнта. Гэта накладае на афіцыйную палітыку адбітак амбівалентнасці. Водападзел праходзіць паміж "памяркоўнымі" лукашэнкаўцамі, якія бачаць у прэзідэнце (ці – хочуць бачыць) абаронцу дэмакратыі і "апантанымі", што жадаюць рэстаўрацыі камуністычнай дзяржавы і/або славянскай імперыі. Сярод першых – галоўны рэдактар газеты "Советская Белоруссия П. Якубовіч, старшыня Канстытуцыйнага суда Р. Васілевіч, сярод другіх – камуністы В. Чыкін, С. Касцян і інш. Барацьба гэтых "кланаў", пра якую сведчаць шэраг аналітыкаў, хоць і не надта афішуецца, уплывае на вобраз А. Лукашэнкі, а ускосна – на яго дзейнасць. У яго прамовах магчыма знайсці і выказванні на карысць дэмакратыі, і антыдэмакратычныя. Гэтая дыскурсіўная (і праксіялагічная) амбівалентнасць можа тлумачыцца гэткай жа дваістасцю свядомасці яго выбаршчыкаў і большай часткі палітычнай эліты Беларусі. Становішча дэідэалагізацыі і анаміі характэрнае для шмат якіх постсавецкіх краін, аднак у Беларусі яно спалучаецца з "памяркоўнасцю" менталітэту беларусаў. Сапраўды, асаблівае геаграфічнае становішча і гістарычныя перыпетыі спрыялі стварэнню своеасаблівай амбівалентнай палітычнай культуры. Яшчэ ў 1921 г. слынны філосаф І. Канчэўскі (Абдзіраловіч) пісаў наступнае: "Ваганьне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога зьяўляецца асноўнаю адзнакаю гісторыі беларускага народу". Далей жа ён сцвярджае: "Каб запеўніць нашаму народу вольную творчасць ува ўсіх галінах жыцьця, трэба стварыць і адпаведныя, свае, беларускія ўмовы жыцця" [3]. Мы мяркуем, што за апошнія 10 год створаны, прынамсі, умовы для стварэння тых форм. Можна, канешне, пагадзіцца з тэзісам сучаснага беларускага філосафа аб тым, што зараз "у беларускім грамадстве нават на пачуцьцёвым узроўні адсутнічае пазытыўны сацыяльны ідэал. Беларускае грамадства ні да чога не імкнецца" [4], аднак ужо самае асэнсаванне адсутнасці ідэалаў ёсць шляха да пераадолення гэтай адсутнасці.

Пасля рэферэндуму 1996 г. адбылася стабілізацыя ўлады і выцясненне альтэрнатыўных поглядаў на самавызначэнне па-за межы афіцыйнага дыскурсу. Гэта – амбівалентная з'ява; будучыня прадэманструе, якімі будуць вынікі пераносу цэнтру цяжару на выканаўчую ўладу (дэкларацыі А. Лукашэнкі аб наданні Нацыянальнаму сходу дадатковых паўнамоцтваў, хутчэй за ўсё, застануцца ў бліжэйшы час дэкларацыямі, бо ў НС няма ўплывовых апазіцыйных груп). Для нашай канцэпцыі амбівалентнасці гэтая з'ява азначае неабходнасць аналізаваць менавіта стан палітычнай свядомасці прадстаўнікоў выканаўчай улады, бо ў "шырокіх мас" і апазіцыйных лідэраў не хапае рэсурсаў (ва ўсіх сэнсах слова), каб утварыць грамадзянскую супольнасць, здольную эфектыўна артыкуляваць свае інтарэсы. Верагодна, гэта тлумачыцца слабасцю

незалежных ад дзяржаўнай "апекі" прадпрымальніцкіх структур: паводле дадзеных М. Залескага, у 1995-1999 гг. колькасць недзяржаўных прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў значна скарацілася. Зараз асноўны прыбытак прадпрымальніцкая дзейнасць дае толькі прыкладна 3 % сямей [5]. Адсюль вынікае малы рэальны ўплыў г.зв. "апазіцыйных" СМІ і партый. Тым ня меней, ніводны палітычны працэс не абыходзіцца без апазіцыі. У Беларусі яна мае больш патэнцыйнай сілы, чым гэта здаецца, калі глядзець на рэйтынгі партый і рэзананс пратэстных мерапрыемстваў. Таму варта звярнуць увагу на амбівалентнасць канцэпцый і дзеянняў як афіцыйнай улады, так і "апазіцыі", якая нярэдка гуляе паводле ўладных правілаў гульні: "Апаненты...рэжыму канцэнтруюцца на сваім унутраным жыцці і актыўна адыходзяць ад рэальнай барацьбы за ўладу, імітуюць, уяўляюць сябе на месцы рэальнай улады" [6].

Амбівалентнасць уладных канцэпцый яскрава выяўляецца ў знешнепалітычнай сферы. Тут дыстанцыя паміж дэкларацыямі і рэчаіснасцю, бадай, найвялікшая. Ёсць падставы сцвярджаць, што афіцыйна пракламаваная ідэя "шматвектарнасці" з'яўляецца проста руханнем у рэчышчы знешняй палітыкі Расіі, пры тым, што стаўленне беларускага кіраўніцтва да Расіі таксама выглядае вельмі амбівалентным. З аднаго боку, яна бачыцца (асабліва "апантанымі") як "родная славянская дзяржава", якая абараняла і абароніць, узбагачала і узбагаціць культурна і эканамічна, з другога – у рыторыцы А. Лукашэнкі праскокваюць пагарджальныя ноткі ў адрас высокіх расійскіх чыноўнікаў, што, аб'ектыўна, магло б выклікаць негатыўныя ўстаноўкі і перашкодзіць рэальнай інтэграцыі. Нагадаем толькі словы А. Лукашэнкі пад час выступлення ў Дзяржаўнай думе Расіі ў 1999 г.: "Что ты перед ней [М. Олбрайт] оправдываешься?", - што былі сказаны ў адрас міністра замежных спраў РФ І. Іванова. Верагодна, кіраўніцтва РБ усё ж-такі не пазбавілася комплексу "малодшага брата" ў сумесных органах Саюзу Беларусі і Расіі. Для Расіі Беларусь і "свая", і "не свая", што паказалі нядаўнія спрэчкі з-за прызначэння выконваючым абавязкі дзяржсакратара Саюзу расійскага чыноўніка (пад час арышту П. Барадзіна). Амбівалентнасць з беларускага боку сілкуецца такой жа з расійскага.

Аднак дваістасць адчуваецца і ў знешнепалітычных ідэях беларускай апазіцыі, якая так і не выпрацавала арыгінальных поглядаў на месца Беларусі ў свеце. Рыторыка кшталту "Беларусь – у Еўропу!" (калі яна геаграфічна і так знаходзіцца ў Еўропе) толькі пашкодзіла апазіцыі, бо не магла мець вялікага ўплыву на амбівалентную свядомасць большасці беларускіх грамадзянаў, якія бачылі ў "Захадзе" ня толькі дабрадзея, але і патэнцыйнага агрэсара, хай сабе эканамічнага. Да таго ж, у асяроддзі апазіцыйных сіл засталося амбівалентнае стаўленне да ліберальнай дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Нават калі не закранаць тэму супярэчнасцяў што да мадэляў развіцця (амерыканскай, нямецкай, шведскай), выбар "рынка" як праграмнай каштоўнасці не быў вынікам цалкам свядомага выбару. Паводле палітычнай культуры шмат хто з апазіцыянераў застаўся "савецкім чалавекам", які кажа тое, што ад яго хочуць чуць (пра залежнасць ад грантаў напісана ўжо шмат). Нельга сцвярджаць, што апазіцыя – спрэс "празаходняя", а ўлады – "прарасійскія": абедзьве ўмоўныя групы амбівалентна ставяцца да суседніх краінаў. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2001 г. у апазіцыйных колах спее ідэя набыць падтрымку афіцыйнай і паўафіцыйнай Расіі – прынамсі, асобных яе эліт.

Эмацыйная і валявая амбіваляентнасць "улады" і "апазіцыі" ва ўчынках абодвух бакоў заўважная і тады, калі йдзецца пра іх узаемныя кантакты. Пра адноснасць паняццяў "улады" і "апазіцыі" ва ўмовах персаніфікацыі першай сведчыць тое, што хто-ніхто з былых апазіцыянераў апынуўся пасля 1996 г. на дзяржаўных пасадах (В. Новікаў, П. Краўчанка), а былыя "слугі рэжыму" перайшлі і пераходзяць на бок "апазіцыі" (А. Фядута, М. Чыгір, Л. Сініцын). Гэта робіць палітычны працэс на "сярэднім узроўні" асабліва цікавым і

малапрадказальным. Амбівалентнае і стаўленне "ўлады" да "апазіцыі": напрыклад, апантаныя прыхільнікі палітыкі і асабістай улады А. Лукашэнкі, што ў 1997-1999 гг. гуртаваліся вакол газеты "Славянский набат", былі гатовыя абвесціць "ворагамі народу" любых іншадумцаў. Жорсткія і некарэктныя выбрыкі, кшталту абвінавачванняў апазіцыянераў у здрадніцтве (у тэлевізійных перадачах кшталту "Рэзананс", "Тайныя спружыны палітыкі"), дысануюць з ідэяй дыялогу, якую "ўлады" рэкламавалі таксама часта і ахвотна. У 1999 г. спробы дыялогу рабіліся, і трэба адзначыць, што ўлады не заганяюць у падполле нават сілы, яўна варожыя (прынамсі, на словах) сучаснаму рэжыму. Апазіцыя ж адказвае ўладзе "ўдзячнасцю": ня могучы пахваліцца паслядоўнасцю, яна паступова скарачца перад легітымнасцю А. Лукашэнкі і яго заканадаўчых ініцыятыў. Так, намеры апазіцыі (у прыватнасці, Каардынацыйнай рады дэмакратычных сіл) ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах 2001 г. азначаюць прызнанне вынікаў рэферэндуму 1996 г. і дзеяздольнасці новага варыянта Канстытуцыі. Ваганні – ад байкоту да ўдзелу – характэрныя і для тактыкі апазіцыйных палітычных сіл пад час выбараў у Палату прадстаўнікоў у 2000 г. Цяпер усё часцей чуюцца заявы кшталту: "Нягледзячы на тое, што вынікі рэферэндуму былі яўна сфальсіфікаваныя..., Канстытуцыя ўзору 1996 г. мае шэраг добрых вартасцей" [7].

Падагульняючы ўсё вышэйсказанае, трэба канстатаваць, што ініцыятыва ў палітычным самавызначэнні беларускай нацыі ў 1990-я гады належала ўладным структурам, таму яго можна на дадзеным этапе вызначыць як "этатысцкае" ці "статацэнтрысцкае". Як вядома, палітычныя партыі ня здолелі – за 10 год! – набыць будзь-які важкі аўтарытэт сярод выбаршчыкаў, што робіць палітыку пераважна справай вярхоў, справай кабінетнай. Хутчэй за ўсё, гэта – ня лепшы варыянт самавызначэння, бо ён вядзе да адчужэння ад палітычнага жыцця здольных іншадумцаў. Не ліквідуючы амбівалентнасці палітычнай культуры ("падобна на тое, што кіруючы рэжым свядома кансервуе існуючы тып палітычнай культуры" [8]), гэты шлях дрэнна адбіваецца на эфектыўнасці кіравання. Адказ на пытанне "куды ідзе Беларусь" застаецца, такім чынам, цьмяным і на пачатку XXI ст.

Канешне, палітычнае самавызначэнне нацыі, па вялікім рахунку, абумоўлена станам палітычнай свядомасці і самасвядомасці тых, хто належыць да нацыі. Палітычная свядомасць шчыльна пераплецена з палітычнай культурай, з'яўляючыся яе стрыжневым элементам. Аднак пошук заканамернасцяў палітычнага працэсу, зыходзячы з асаблівасцей палітычнай культуры грамадзянаў РБ (збольшага "падданіцкай", амбівалентнай паводле вызначэння) патрабуе асобнага разгляду.

Літаратура


1. Давыдов Ю.Н., Огурцов А. П. Амбивалентность // Современная западная социология: Словарь. М., 1990. Цыт. па: www.defacto.examen.ru
2. Божанов В. А. Кризис власти в 1995-96 гг.: разрешение или усложнение? // Власть и жизнь. Международная научная конференция 11-12 декабря 1997 г. Мн., 1998. – С. 92.
3. АбдзіраловічІ. Адвечным шляхам. Мн.,1993. Цыт. па: http://knihi.com/abdziralovic/shlach1.html.
4. Булгакаў В. Дэклясаваная эліта // Arche-Скарына. № 4 (9). 2000. – С. 13.
5. Залесский М. Купцы последней гильдии // Хроника несостоявшегося времени. Мн.,2001.–С.237.
6. Быковский П. Проект "Республика Беларусь" // Хроника несостоявшегося времени. Мн., 2001. – С. 84.
7. Левшунов С. Референдум по конституционной реформе // Згода. № 12. 24.03.2001. – С. 4.
8. Быковский П. Указ.соч. С. 66.